ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (1070) ● Чацвер, 21 лістапада 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

СЁННЯ У НУМАРЫ:

● СУМЕСНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ● ВОПЫТ ЛЕПШАЙ ГРУПЫ ● АГЛЯД ДРУКУ ● ВЫКЛІКАЕМ НА РАЗМОВУ ● ВЫСТУПАЕ СТАРАСТА ● СПОРТ

ЗАЦІКАЎЛЕНАЕ АБМЕРКАВАННЕ

НА ГЭТЫ раз на павестцы дня пленума камітэта камсамола БДУ, праведзенага сумесна з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, стаяла пытанне: аб рабоце камітэта камсамола філалагічнага факультэта па арганізацыі самастойнага вывучэння студэнтамі факультэта твораў класікаў марксізму-ленінізму.

У першую чаргу, як адзначыла ў выступленні сакратар камітэта камсамола Л. Агароднік, камсамольскія арганізацыі курсаў і вучэбных груп узяліся за строгае і планамернае назіранне за самастойнай работай студэнтаў. Вучэбна-выхаваўчая камісія камітэта камсамола сумесна з вучэбна-метадычнымі камісіямі курсаў сістэматычна заслухоўваюць справаздачы акадэмічных сектараў, прымаюць адпаведныя меры ўздзеяння на студэнтаў, якія не паспяваюць.

Паспяховасць па гісторыі КПСС на факультэце складае 98,9 працэнта.

Камітэт камсамола актыўна шукае шляхі паляпшэння паспяховасці. Практыкуюцца нарады камсамольскага актыву вучэбных груп, на якіх абмяркоўваюцца пытанні самастойнай работы камсамольцаў. Студэнты філфака з глыбокім інтарэсам вывучаюць творы У. І. Леніна. Вынік — даклады, рэфераты, з якімі будучыя спецыялісты выступаюць перад шырокай аўдыторыяй у падшэфных школах і на прадпрыемствах. Толькі ў гэтым годзе студэнты прачыталі 450 лекцый, больш 170 —па ленінскай тэматыцы.

Вывучаюць студэнты ленінскую тэарэтычную спадчыну і на факультэце грамадскіх прафесій. Больш 140 слухачоў факультэта выступаюць перад насельніцтвам, з'яўляюцца арганізатарамі ленінскіх гурткоў у падшэфных школах.

Аб тым, як праходзілі на факультэце Ленінскія ўрокі, расказала студэнтка III курса Г. Адамовіч. На Ленінскія ўрокі запрашаюцца першыя камсамольцы, арганізуюцца прагляды кінафільмаў аб жыцці У. І. Леніна, дыяпазітываў.

Г. Адамовіч прапанавала зрабіць тэматыку Ленінскіх урокаў больш разнастайнай, запрашаць перадавікоў працы, ленінскіх стыпендыятаў, праводзіць Ленінскія ўрокі па асобных творах У. І. Леніна.

На сённяшні дзень важнай задачай камсамольскіх арганізацый ВНУ з'яўляецца далейшае развіццё грамадска-палітычнай практыкі і атэстацыі студэнтаў. Аб тым, як праходзіць грамадска-палітычная атэстацыя на філфаку, расказаў М. Ціцянкоў, намеснік сакратара камітэта па ідэалагічнай рабоце.

У спецыяльныя камісіі ўваходзяць члены камітэта камсамола, выкладчыкі, прадстаўнікі парткома і прафкома. Атэстацыя праводзіцца па спецыяльных білетах, якія ўключаюць пытанні па тэорыі і практыцы камсамольскай работы.

Члены камісіі маюць атэстацыйны ліст мінулага года, што дае магчымасць выявіць, як рэалізаваны крытычныя заўвагі, выказаныя раней.

Студэнты I курса толькі пачалі вывучэнне гісторыі КПСС. Навыкаў самастойнай работы ў іх пакуль яшчэ мала. Дапамагчы ім набыць гэтыя навыкі — абавязак як выкладчыкаў, так і камсамольскай арганізацыі.

Бюро нашай групы, гаворыць студэнтка IV групы першага курса В. Шот, кантралюе падрыхтоўку да семінараў, удзел у практычных занятках. Рашылі запрасіць вопытных метадыстаў, каб яны расказалі, як правільна канспектаваць, дзе і як браць дадатковую літаратуру.

А потым слова бяруць выкладчыкі. Дэкан філалагічнага факультэта А. А. Воўк адзначыў, што ўважлівыя адносіны камсамольскай арганізацыі да вывучэння грамадскіх дысцыплін далі пэўныя поспехі. Студэнты сталі сур'ёзней адносіцца да вывучэння твораў класікаў марксізму-ленінізму, вядуць граматныя канспекты, актыўна ўдзельнічаюць у практычных занятках.

Дацэнт кафедры гісторыі КПСС Л. П. Максімава прапанавала адкрыць кабінет гісторыі КПСС на філфаку. Гэта дапаможа студэнтам з меншай затратай часу глыбей вывучаць марксісцка-ленінскую тэорыю.

У сваім выступленні сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч закрануў пытанні далейшага развіцця форм самастойнага вывучэння грамадскіх навук. Трэба яшчэ больш увагі ўдзяляць арганічнаму адзінству вучэбнага працэсу і пазавучэбных форм работы, падкрэсліў ён, удасканальваць навукова-даследчую работу студэнтаў, арганізоўваць факультатывы, навуковыя клубы. Заслугоўвае ўвагі прапанова аб правядзенні Ленінскіх урокаў у ленінскіх пакоях і музеях, аб стварэнні студэнцкіх саветаў пры кафедрах грамадскіх навук, якія б аналізавалі ход бягучай паспяховасці, кантралявалі самастойную работу. Патрэбнай і змястоўнай формай з'явіліся б студэнцкія дыскусійныя клубы і лекторыі. Але рашэнню гэтых пытанняў пакуль яшчэ не ўдзяляецца патрэбная ўвага.

У заключэнне выступіў рэктар універсітэта, загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў прафесар У. М. Сікорскі. Падводзячы вынікі адбыўшагася абмеркавання, У. М. Сікорскі сказаў, што сама форма правядзення такіх пасяджэнняў вельмі карысная. Устанаўліваюцца больш цесныя сувязі паміж выкладчыкамі, камсамольскім актывам і студэнтамі. Яны дапамагаюць выявіць новыя пазавучэбныя формы павышэння ведаў па грамадскіх навуках, развіць і выхаваць у студэнтаў унутраную патрэбу ў вывучэнні марксісцка-ленінскай тэорыі, жаданне самастойна працаваць над творамі класікаў марксізму-ленінізму.

Камітэт камсамола рэкамендаваў абмеркаваць прынятае на пасяджэнні рашэнне на кожным факультэце.

А. КАМЕНКА.

НА ЗДЫМКАХ: на пасяджэнні выступае рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі.

Фота А. ЦЫГУЛЁВА.

НА ГЕАФАКУ

Пытанні падрыхтоўкі да правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў II—IV курсаў і аб вучобе камсамольскага актыву разгледжаны на пасяджэнні камсамольскага бюро факультэта.

***

Сустрэча з былым памочнікам ваеннага аташэ ў Велікабрытаніі Аляксандрам Васільевічам Фядотавым зацікавіла многіх. І, зразумела, геафакаўцы не прапусцяць магчымасці больш даведацца аб замежнай краіне, тым больш, што Аляксандр Васільевіч расказаў многа цікавага аб норавах і звычках англічан, аб іх быце, аб жыцці англійскіх студэнтаў і, нарэшце, аб своеасаблівасцях і прыгажосці Лондана. Карта Лондана, каляровыя дыяпазітывы і паштоўкі дапамагалі слухачам больш поўна ўявіць тое, аб чым расказаў былы дыпламат.

***

Адзінаццаты выпуск фотахронікі геафака, які падрыхтаваў студэнт II курса Мікалай Еўдакіменка, перадае прыўзняты святочны настрой, з якім прайшла па ўпрыгожаных вуліцах Мінска кастрычніцкая калона факультэта.

***

Агітбрыгада студэнтаў-географаў правяла ў падшэфнай воінскай часці тэматычны вечар «Широка страна моя родная». Студэнты-трэцякурснікі расказалі аб Урале, Каўказе, Карэлії, дзе яны былі ў гэтым годзе на практыцы. З лекцыяй аб БДУ выступіла Надзея Паўлаўна Хрыпко, дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Аб гісторыі Мінска са старажытных часоў да нашых дзён расказала дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі СССР Людміла Андрэеўна Паўловіч.

***

З лекцыяй «Будучае Мінска» выступіў перад студэнтамі і супрацоўнікамі факультэта член Саюза архітэктараў БССР дацэнт Я. Заслаўскі.

САМЫ ДАРАГІ ДАКУМЕНТ

ДА АБМЕНУ КАМСАМОЛЬСКІХ ДАКУМЕНТАЎ

Прайшло ўжо паўгода з таго дня, як завяршыў сваю работу XVII з'езд ВЛКСМ. Гэта быў час напружанай, мэтанакіраванай работы камсамольскіх арганізацый па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС, заданняў дзевятай пяцігодкі.

У ліку мер, накіраваных на далейшае арганізацыйна-палітычнае ўмацаванне радоў камсамола, павышэнне актыўнасці камсамольцаў, важнае месца адводзіцца абмену дакументаў, які хутка адбудзецца. Рашэнне аб ім прыняў, як вядома, XVII з'езд ВЛКСМ. У Маскве адбыўся пленум ЦК ВЛКСМ, які разгледзеў пытанне «Аб правядзенні абмену камсамольскіх дакументаў». У пастанове пленума падкрэсліваецца, што абмен камсамольскіх дакументаў — «важнае арганізацыйна-палітычнае мерапрыемства, накіраванае на далейшае павышэнне працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці членаў ВЛКСМ, паляпшэнне работы камсамольскіх арганізацый...».

Поспех яго будзе заключацца не проста ў тым, што цяперашнія дакументы замяняць новыя, а ў павышэнні ўзроўню працы ўсіх звенняў камсамола, узмацненні авангардной ролі членаў ВЛКСМ сярод моладзі, яшчэ большай згуртаванасці камсамольскіх радоў.

Маючы адбыцца абмен закранае ўсе бакі дзейнасці камсамола.

Увагу належыць засяродзіць на вырашэнні наступных задач.

Павышэнне працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольцаў, іх авангардной ролі ў барацьбе моладзі за паспяховае выкананне заданняў дзевятай пяцігодкі.

Узмацненне ідэйнай, класавай загартоўкі моладзі. Камсамолец, вучыцца ён у школе ці прафесійна-тэхнічным, вучылішчы, ВНУ, працуе на заводзе, будоўлі або ў калгасе, абавязан пастаянна авалодваць марксізмам-ленінізмам, вяршынямі ленінскай думкі.

Належыць настойліва ўдасканальваць сістэму камсамольскай палітычнай вучобы, практыку Ленінскіх урокаў, Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!»

Узмацненне выхавання моладзі ў духу камуністычнай маралі. Кожны камсамолец павінен паказваць прыклад высокай маральнасці, абавязкова выконваць правілы сацыялістычнага супольнага жыцця, змагацца з парушэннямі норм камуністычнай маралі.

У ходзе абмену дакументаў камітэтам камсамола неабходна заняць больш актыўную пазіцыю ў рашэнні пытанняў маральнага выхавання моладзі, стварыць у камсамольскіх арганізацыях такую атмасферу, такую грамадскую думку, якая поўнасцю выключыла б парушэнні камсамольцамі прынцыпаў маральнага кодэксу будаўніка камунізму. Асаблівая ўвага — барацьбе з такімі антыподамі камуністычнай маральнасці, як хцівасць і эгаізм, п'янства і хуліганства. Ні адзін факт адступлення ад норм нашай маралі, савецкага ўкладу жыцця не павінен заставацца без асуджэння камсамольскай арганізацыяй!

Далейшае арганізацыйна-палітычнае ўмацаванне камсамольскіх арганізацый. Вынікам абмену павінны стаць яшчэ большая згуртаванасць, дысцыплінаванасць, арганізацыйная моц камсамольскіх радоў. Павышэнне патрабавальнасці да кожнага камсамольца за выкананне Статута ВЛКСМ, актыўная, энергічная работа камітэтаў камсамола, выбарнага камсамольскага актыву — усё належыць накіраваць на тое, каб зрабіць кожную камсамольскую групу, пярвічную арганізацыю сапраўды баявой ячэйкай камсамола, якая б выконвала адказныя задачы выхавання моладзі.

У ходзе падрыхтоўкі і правядзення абмену дакументаў неабходна прадаўжаць удасканаленне структуры камсамольскіх арганізацый у адпаведнасці са зменамі, якія ўнесены XVII з'ездам у Статут ВЛКСМ. Гэтыя змены дазваляюць стварыць дадаткова дзесяткі тысяч арганізацый з правамі пярвічных, адкрываюць новыя магчымасці для таго, каб цэнтрам выхаваўчай работы сапраўды былі цэх, участак, брыгада.

Абмен камсамольскіх дакументаў пачынаецца ўслед за важнай падзеяй у жыцці партыі — абменам партыйных дакументаў, які адыграў вялікую ролю ў далейшым умацаванні партыі, павышэнні баяздольнасці яе радоў. Вучыцца ў партыі, абапірацца на яе багаты вопыт, творча выкарыстоўваць яго ў ходзе падрыхтоўкі і правядзення абмену камсамольскіх дакументаў—задача кожнага камітэта камсамола.